*Тв.:* Не так это просто, когда за девяносто. Иркутск, 2008. *Р.І.Баравік.*

**КАЗІНЕ́Ц** Міхаіл Антонавіч (н. 18.5.1938, в. Цынцавічы Вілейскага р-на), беларускі дырыжор, педагог. Засл. дзеяч мастацтваў Беларусі (1978). Нар. артыст Беларусі (1987). Скончыў Бел. кансерватоімыю па класах баяна (1965) і оперна-сімф. дырыжыравання (1973), з 1966 выкладаў у ёй (з 1990 праф., у 1985—2005 рэктар). З 1972 дырыжор, з 1975 маст. кіраўнік і гал. дырыжор Нац акадэмічнага нар. аркестра імя І.І.Жыновіча. У рабоце з аркестрам вял. ўвагу аддае пытанням строю, збалансаванасці гучання розных аркестравых груп, нюансіроўцы, тэмбравай маляўнічасці. К. — першы інтэрпрэтатар многіх твораў бел. музыкі, у т.л. кантаты для хору, салістаў і нар. аркестра «Родныя песні» Ю.Семянякі, канцэрта для фп. і нар. аркестра Г.Вагнера, «Святочнай паэмы» і «Юбілейнай уверцюры» Я.Глебава, 2-га канцэрта для цымбалаў і аркестра Д.Смольскага, сімфаньеты і ўверцюры «Беларускія вячоркі» К.Цесакова, канцэрта для аркестра нар. інструментаў В.Іванова, фрэскі-карціны «Зямля бацькоў» і ўверцюры «Свята ўраджаю» В.Войціка, сімфоніі «Памяць зямлі», муз. карціны «На Купалле», «Саўка і Грышка» А.Мдывані і інш. Ганаровы грамадзянін Міншчыны (2013). Дзярж. прэмія Беларусі 1984.



*М.А.Казінец.*

**КАЗІ́ШЧАНСКАЯ ТРО́ІЦКАЯ ЦАРКВА́**, помнік архітэктуры драўлянага дойлідства з элементамі рэтраспектыўна-рускага стылю ў в. Казішча Кобрынскага р-на. Пабудавана ў 1927 з дрэва. Мае 3-часткавую (прытвор, малітоўная зала, алтар) аб'ёмна-прасторавую кампазіцыю, вырашаную ў выглядзе прамавугольнага зруба, працяглую па падоўжнай восі, завершаную 5-граннай апсідай. Квадратны ў плане асн. аб'ём накрыты 4-схільным дахам, завершаны 8-гранным светлавым барабанам з гранёнай цыбулепадобнай галоўкай. Зах. фасад акцэнтаваны 2-ярусай чацверыковай званіцай, якая мае трохвугольныя франтоны над праёмамі верхняга яруса. Званіца завершана высокім шатровым дахам з цыбулепадобнай галоўкай. Да гал. арачнага ўвахода далучаецца 4-слупавы ганак, накрыты 2-схільным дахам. Цокальная і фрызавая часткі вылучаны вертыкальнай шалёўкай, гарызантальна ашаляваныя плоскасці сцен прарэзаны прамавугольнымі і арачнымі аконнымі праёмамі. Храм унесены ў Дзярж. спіс гісторыка-культ. каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Царква дзейнічае. *Г.А.Лаўрэцкі.*



*Казішчанская Троіцкая царква.*

**КАЗІЯ́ТКА** Юрый Васілевіч (н. 24.4.1964, г. Брэст), беларускі журналіст. Скончыў Курганскае вышэйшае ваенна-паліт. авіяцыйнае вучылішча (1985). Працаваў ваен. карэспандэнтам у Расіі. З 1995 у Нац. дзярж. тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь: вядучы тэлерадыёпраграм, паліт. аглядальнік. З 2002 гал. рэдактар Службы навін, з 2003 генеральны дырэктар ЗАТ «Другі нацыянальны тэлеканал», з 2005 — ЗАТ «Сталічнае тэлебачанне». Аўтар і вядучы ток-шоу «Сёння з вамі...», публіцыст. праграм «Тэма дня», «Падзея», «Вялікая палітыка», «Палітыка», «Карціна свету» і інш. Аўтар сцэнарыя і вядучы 12-серыйнага дакум. тэлефільма «Найноўшая гісторыя» (2004). Дзярж. прэмія Беларусі 2004.



*Ю.В.Казіятка.*

**КА́ЗКА**, вуснае мастацкае апавяданне, пераважна празаічнае, чарадзейнае, авантурнага або быт. характару з устаноўкай на выдумку; адзін з асн. і самых пашыраных жанраў нар.-паэт. творчасці. Па міжнар. паказальніку казачных сюжэтаў К. падзелены на

3 асн. групы: К. пра жывёл, уласна К. і анекдоты. У сваю чаргу кожная з груп мае больш дробны падзел. У залежнасці ад персанажаў К. пра жывёл падзяляюцца на К. пра дзікіх, пра дзікіх і свойскіх жывёл, пра чалавека і дзікіх жывёл і г.д. Уласна К. падзяляюцца на 4 групы: чарадзейныя, легендарныя, навелістычныя, казкі пра дурнога чорта. Трэцяя група — анекдоты — падзяляецца ў адпаведнасці з асаблівасцямі тэматыкі: пра жанчын (дзяўчат), пра шчасце і інш. У сучасным казказнаўстве вылучаюць жанравыя разнавіднасці К.: пра жывёл, чарадзейныя, легендарныя, навелістычныя, сац.-быт. Некаторыя казказнаўцы вылучаюць сярод К. пра жывёл кумулятыўныя або ланцужковыя па асаблівасцях кампазіцыі і сатырычныя па стаўленні да рэчаіснасці. К. ўзніклі ў глыбокай старажытнасці і прайшлі складаны шлях эвалюцыі. Першапачатковa яны былі звязаны з міфал. поглядамі і ўяўленнямі людзей, з анімізмам, татэмізмам, магіяй. Рэальныя назіранні людзей у К. перапляталіся з фантастыкай: апавядалася пра цудоўнае паходжанне нашых продкаў, пра іх незвычайную сілу і здольнасці, пра перамогі над цёмнымі сіламі, што адлюстроўвала культ продкаў, а таксама мару пра лепшае жыццё. Як творы мастацтва К. былі сродкам пазнання рэчаіснасці, абагульнялі працоўны вопыт многіх пакаленняў, задавальняючы маст. густы народа, выконвалі выхаваўчую функцыю. Нягледзячы на фантазію і маст. ўмоўнасць, К. гістарычна звязаны з жыццём, адлюстроўваюць грамадскія інтарэсы народа, яго этычныя і эстэтычныя ідэалы і нормы, спрыяюць матэрыяльнаму і духоўнаму развіццю грамадства. Разам з інш. жанрамі фальклору К. складаюць важную галіну культуры, якая забяспечвае эстэтычныя запатрабаванні народа, адпавядаюць сац. і маральным уяўленням, імкненню да творчасці. У любой К. адчуваецца асоба выканаўцы, якая праяўляецца ў розных кантамінацыях, своеасаблівых трактоўках сюжэта, сатыр. персанажаў. Кожны раз выканаўца прыўносіць у тэкст перамены, пераасэнсоўвае матывы, уключае дадатковыя матывіроўкі, адбірае стыліст. сродкі, якія і ўтвараюць своеасаблівасць, непаўторнасць. Казачны сюжэт носіць канфліктны характар, заўсёды прадстаўлены супрацьборствам двух бакоў: Кашчэй — Іван-царэвіч, мачыха — падчарыца, воўк — ліса, пан — мужык і інш. Прызначэнне К. абумоўлена яе эстэтычнай функцыяй — пацешыць, развесяліць. У сувязі з гэтым казачнік з'яўляецца своесаблівым акцёрам, які павінен добра ведаць матэрыял, цікава паднесці яго слухачам, валодаць майстэрствам імправізацыі. Характэрнай асаблівасцю К. з'яўляецца тое, што яна апавядаецца і ўспрымаецца як выдумка, гульня фантазіі. Але за прыгодамі казачных герояў у інш. землях паўстаюць чалавечыя лёсы, складаныя быт. і сац. адносіны. Змест К. разнастайны і складаны: у адных пераважаюць фантаст. элементы, у другіх — дзейнічаюць спецыфічныя персанажы, у трэціх увасабляюцца сац. канфлікты, быт. фон. Многія бел. К. вылучаюцца нац. адметнасцямі. Напр., у К. пра лісу і ваўка звяртаюць на сябе ўвагу перадача быт. прыкмет, асаблівы стыль гаворкі дзеючых асоб, ласкавыя звароты («кумка», «галубка», «кумок»), спецыфіка інтанацыйнай мовы («От табе на»), настойлівасць, з якой ліса вучыць ваўка і інш. Шырокая папулярнасць К. тлумачыцца тым, што яна адлюстроўвае светапогляд народа, яго сац., філас., этычныя, маральныя ўяўленні аб сэнсе жыцця, адносінах паміж людзьмі, вырашае вечныя пытанні існавання вял. і складанага свету, дзе сутыкаюцца дабро і зло, любоў і нянавісць, праўда і мана, беднасць і багацце. Бел. нар. К. вядомыя пераважна па зборніках 19 — пач. 20 ст. Іх запісвалі М.А.Дзмітрыеў, П.В.Шэйн, Е.Р.Раманаў, У.М.Дабравольскі, М. Федароўскі, А.К.Сержпутоўскі і інш.

*Літ.*: Бараг Л.Р. Беларуская казка. Мінск, 1969; Яго ж. Сюжэты і матывы беларускіх народных казак. Мінск, 1978; Беларускі фальклор: Жанры, віды, паэтыка. Кн. 4. Народная проза. Мінск, 2002.

*А.М.Аляхновіч.*

**КА́ЗКА-АНЕКДО́Т**, жанравая разнавіднасць фальклорнай казкавай прозы, якая спалучае рысы сац.-быт. казкі і *анекдота*. У яе аснове ляжыць быт. камічны сюжэт, насычаны маст. дэталямі і разгорнутымі апісаннямі, які лёгка кантамінуецца з інш. сатыр. сюжэтамі, што характэрна для казкі. Заканчваецца твор нечаканай камічнай развязкай. У сістэме маст. прыёмаў і сродкаў стварэння камічнага эфекту асабліва месца належыць *гратэску*. У К.-а. асуджаюцца негатыўныя сац. з'явы, высмейваюцца чалавечыя заганы. Казкам уласціва непрымірымасць да ўсяго адмоўнага і заганнага ў жыцці. Як самаст. разнавіднасць К.-А. вылучаецца не ўсімі даследчыкамі. Так, некаторыя даследчыкі (У.Проп) адносяць яе да быт. казкі, лічачы, што межы паміж быт. казкамі і анекдотамі не вызначаюцца, іншыя (Е.Меляцінскі), не вылучаючы адзначаную групу казак як самаст. жанравую разнавіднасць, усе сац.-быт. казкі называюць анекдатычнымі або К.-а. Сярод бел. даследчыкаў адным з першых да К.-а. звярнуўся Л.Бараг. Грунтоўны аналіз казак праведзены А.Фядосікам. Ён раскрыў іх спецыфіку як жанравай разнавіднасці, вызначыў месца ў сістэме казачнага жанру, паказаў шляхі ўзнікнення і развіцця.

*Літ.*: Бараг Л.Р. Сюжэты і матывы беларускіх народных казак. Мінск, 1978; Сравнительный указатель сюжетов: Восточнославянская сказка. Ленинград, 1979; Федосик А.С. Сказка-анекдот // Восточнославянский фольклор. Слов. науч. и нар. терминологии. Минск, 1993; Яго ж. Народныя анекдоты і жарты // Народная проза. Мінск, 2002.

*В.А.Вараб'ёва.*

**КА́ЗКІ АВАНТУ́РНА-НАВЕЛІСТЫ́ЧНЫЯ**, жанр фальклорнай каза-